# Прадмова

Прапанаваныя ў метадычным дапаможніку планы-канспекты ўрокаў складзены згодна з дзеючымі вучэбнымі праграмамі для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання.

Мэта дапаможніка — палегчыць падрыхтоўку настаўніка да ўрока ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі да арганізацыі адукацыйнага працэсу па беларускай мове на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Размеркаванне вучэбнага матэрыялу адпавядае зместу падручніка (*Свірыдзенка, В. І.* Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 2 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання / В. І. Свірыдзенка. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2020).

Аўтары выкарыстоўваюць заданні, якія стымулююць пазнавальную актыўнасць вучняў, патрабуюць самастойнага пошуку інфармацыі, яе выкарыстання для выканання вучэбных і практычных задач. Таксама прапануюцца практыкаванні на ўзбагачэнне слоўнікавага запасу навучэнцаў, засваенне вымаўленчых нормаў і правілаў правапісу, развіццё творчых здольнасцей пры стварэнні ўласных вусных і пісьмовых выказванняў.

Змест працы па каліграфіі звязваецца з вывучаемым на ўроку фанетычным, лексічным, граматычным матэрыялам.

Звярніце ўвагу на разнастайныя віды работ на ўроку: работа з тэкстам, тэставыя заданні, складанне гексаў, кластараў па тэме, інтэрактыўныя заданні (спасылкі на learningapps.org).

Безумоўна, матэрыял неабходна выкарыстоўваць творча, улічваючы псіхалагічныя асаблівасці вучняў, а таксама іх здольнасць успрымаць вучэбны матэрыял.

# Урок 48

## Цвёрдыя і мяккія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме

**Мэта:** фарміраванне паняцця «цвёрдыя і мяккія зычныя гукі».

**Задачы:**
- пазнаёміць з парнымі цвердымі — мяккімі зычнымі гукамі;
- вучыць абазначаць мяккасць зычных з дапамогай літар *е, ё, ю, я, ь*;
- пашыраць лексічны запас вучняў словамі лексіка-семантычнай групы «рыбы»;
- развіваць назіральнасць, выхоўваць любоў да прыроды.

### Ход урока

#### I. Арганізацыйны этап

Званочкам звонкім урок павітаўся.
Сядзем за парты. Занятак пачаўся!

#### II. Этап праверкі дамашняга задання

— Праверым дамашняе заданне.

***Практыкаванне 275, с. 142.***

— Якія літары ўставілі ў словах *сястрычкі, каляровыя, цяплей*. (*Літары **я**.*)

— Растлумачце чаму напісалі літару ***я***?

— Як змянілі выдзеленае слова *цяплей*? (*Цёплы.*)

#### III. Этап падрыхтоўкі вучняў да асэнсаванага засваення новага матэрыялу

**3.1. Арфаграфічная размінка.**

— Устаўце прапушчаныя літары, растлумачце іх напісанне.

**Карась**

Зак..паўся карась
У р..чную гразь.
Ц..пла, д..бра карасю,
Так праспіць ён ..сю зіму.

— У рэках і азёрах Беларусі водзіцца 68 відаў рыб. 9 відаў знаходзяцца пад пагрозай знікнення. Таму ў нашай краіне існуюць правілы вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства.

— Адгадайце рэбусы. Атрыманныя словы ўключым у хвілінку чыстапісання.

’ Ы  АК  А

С=Б

*рыбы* *рыбак* *рака*

**3.2. Хвілінка чыстапісання.**

— Запішыце літары і склады, чаргуючы іх да канца радка.

*Р р Ра ры рэ*

— Запішыце словы і сказ.

*рыбы рыбак рака*

*Рыба маленькая, ды юшка салодкая.* (Рыба мелка, да уха сладка — рус.)

**3.3. Пашырэнне лексікі вучняў. Работа з фразеалагізмамі.**

- *Як рыба ў вадзе* (адчуваць сябе камфортна, утульна, упэўнена, вельмі добра арыентавацца, у чым-небудзь разбірацца).
- *Трапляцца на вуду* (быць падманутым, перахітрыць).
- *Біцца як рыба аб лёд* (настойлівыя, але марныя намаганні (безвыніковая дзейнасць)).

Настаўнік дэманструе малюнак с рыбай сом.

— Хто ведае назву гэтай рыбы?

— Так. Гэта сом. Сом лічыцца самым буйным прадстаўніком рыб, якія жывуць на тэрыторыі Беларусі. Аддае перавагу глыбінным участкам рэк і вадаёмаў.

— Запішыце слова *сом*. Колькі зычных гукаў у слове? Колькі галосных? Змяніце галосны, каб атрымалася лічба першага дзясятка. (*Сом — сем.*)

— Словы *сом* і *сем* адрозніваюцца не толькі напісаннем, але і вымаўленнем зычнага гука [с]. У слове *сом* гук [с] вымаўляецца цвёрда, а ў слове *сем* гук [с’] вымаўляецца мякка.

Настаўнік пачынае запаўняць табліцу.

| Вымаўляецца цвёрда | Вымаўляецца мякка |
|---|---|
| | |

## IV. Этап засваення новага матэрыялу

— Сёння на ўроку мы пазнаёмімся з паняццямі «цвёрдыя і мяккія зычныя гукі». Навучымся адрозніваць цвёрдыя і мяккія зычныя гукі.

# ЛІТАРАТУРА


1. Беларуская мова. Навучанне чытанню і пісьму. Сшытак 4. 2 клас : дапам. для агульнаадукац. устаноў з рус. мовай навучання / В. С. Сцяпурка, Я. Я. Кузьміч, А. С. Кавалевіч. Мн., 2008.
2. Беларуская мова: Фізхвілінкі [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://belaruskaja.blogspot.com/p/blog-page_1.html. — Дата доступу: 10.08.2021.
3. Загадкі [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://sad-dolginovo.schools.by/pages/zagadk. — Дата доступу: 10.08.2021.
4. Загадкі на беларускай мове [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://uchitelskiportvel.blogspot.com/p/blog-page_2.html. — Дата доступу: 10.08.2021.
5. Канспект урока па прадмеце «Чалавек і свет. “Рыбы”». 2 клас [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://infourok.ru/kanspekt-uroka-pa-pradmece-chalavek-i-svet-ribi-klas-2041993.html. — Дата доступу: 10.08.2021.
6. *Паўлоўскі, І. І.* Беларуская мова: зборнік кантрольных работ (спісванні, дыктанты, дыктанты з граматычным заданнем): 1—4 класы: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларускай мовай навучання / І. І. Паўлоўскі. 3-е выд. Мн., 2014.
7. *Свірыдзенка, В. І.* Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 2 класа агульнаадукацыйных устаноў з рускай мовай навучання / В. І. Свірыдзенка. Мн., 2020.
8. *Сямак, А. Л.* Алімпіяды па беларускай мове. 2—4 класы / А. Л. Сямак. Мн., 2015.
9. Тэкст для перакладу. 2 клас / Учебные материалы. Методические рекомендации для учителей [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://uma.by/foxy/belaruskaya-mova/tekst-dlya-perakladu-2-klas.html. — Дата доступу: 16.08.2021.
10. Фізкультхвілінкі [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://multiurok.ru/files/fizkultminutki.html. — Дата доступу: 15.08.2021.
11. Фізкультхвілінка — карысны адпачынак / Брестский областной институт развития образования [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://boiro.by/деятельность/педагогический-опыт/document-60433.html. — Дата доступу: 16.08.2021.
12. Фізкультхвілінкі на ўроку / Блог настаўніка беларускай мовы і літаратуры Ралавай Аляксандры Уладзіміраўны [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://aleksandraralova2013.blogspot.com/p/blog-page_70.html. — Дата доступу: 16.08.2021.

## Змест


Урок 48. Цвёрдыя і мяккія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме . . . . . 2
Урок 49. Цвёрдыя і мяккія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме . . . . . 6
Урок 50. Зычныя гукі [д] — [дз'] . . . . . 10
Урок 51. Зычныя гукі [д] — [дз'] . . . . . 15
Урок 52. Зычныя гукі [д] — [дз'] . . . . . 20
Урок 53. Зычныя гукі [т] — [ц'] . . . . . 26
Урок 54. Зычныя гукі [т] — [ц'] . . . . . 30
Урок 55. Зычныя гукі [т] — [ц'] . . . . . 34
Урок 56. Зычныя гукі [т] — [ц'] . . . . . 38
Урок 57. Зацвярдзелыя зычныя гукі . . . . . 42
Урок 58. Зацвярдзелыя зычныя гукі . . . . . 46
Урок 59. Зацвярдзелыя зычныя гукі . . . . . 50
Урок 60. Звонкія і глухія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме . . 54
Урок 61. Звонкія і глухія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме . . 59
Урок 62. Звонкія і глухія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме . . 65
Урок 63. Звонкія і глухія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме . . 70
Урок 64. Падоўжаныя зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме . . . 75
Урок 65. Падоўжаныя зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме . . . 79
Урок 66. Падоўжаныя зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме . . . 83
Урок 67. Падоўжаныя зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме . . . 86
Урок 68. Раздзяляльныя знакі — апостраф (') і мяккі знак (ь) . . 89
Урок 69. Раздзяляльныя знакі — апостраф (') і мяккі знак (ь) . . 93
Урок 70. Раздзяляльныя знакі — апостраф (') і мяккі знак (ь) . . 98
Урок 71. Раздзяляльныя знакі — апостраф (') і мяккі знак (ь) . . 102
Урок 72. Абагульняльны ўрок па раздзеле «Гукі і літары». Кантрольная работа па раздзеле «Гукі і літары» . . . . . 106
Урок 73. Значэнне слова. Знаёмства з перакладнымі слоўнікамі (руска-беларускім, беларуска-рускім) . . . . . 111
Урок 74. Словы, якія называюць прадметы . . . . . 116
Урок 75. Словы, якія называюць прадметы . . . . . 120

Урок 76. Прыназоўнік. Правапіс прыназоўнікаў. Кантрольны слоўнікавы дыктант . . . . . . . . . . . . . . . . . 123
Урок 77. Словы, якія называюць прыметы прадметаў . . . . . . . 126
Урок 78. Словы, якія называюць прыметы прадметаў . . . . . . . 131
Урок 79. Словы, якія называюць дзеянні прадметаў . . . . . . . . 136
Урок 80. Словы, якія называюць дзеянні прадметаў . . . . . . . . 141
Урок 81. Сказ. Выражэнне ў сказе закончанай думкі. Афармленне сказа на пісьме . . . . . . . . . . . . . . . . . 144
Урок 82. Вызначэнне слоў, якія абазначаюць, пра каго ці пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца . . . . . . . . . . 150
Урок 83. Вызначэнне слоў, якія абазначаюць, пра каго ці пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца . . . . . . . . . . 155
Урок 84. Вызначэнне сувязі слоў у сказе . . . . . . . . . . . . 159
Урок 85. Кантрольны дыктант . . . . . . . . . . . . . . . . . . 165
Урок 86. Тэкст. Адрозненне тэксту ад набору сказаў . . . . . . . 166
Урок 87. Тэма і галоўная думка тэксту . . . . . . . . . . . . . 170
Урок 88. Загаловак. Навучальны пераказ . . . . . . . . . . . . 174
Урок 89. Падзел тэксту на часткі: пачатак, асноўная частка, заключная частка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 178
Урок 90. Абагульняльны ўрок . . . . . . . . . . . . . . . . . . 182
Урок 91. Паўтарэнне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 187
Урок 92. Паўтарэнне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 191
Урок 93. Паўтарэнне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 196
*Дадатак. Фізкультхвілінкі* . . . . . . . . . . . . . . . . . . 201
*Літаратура* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 206

Зак. 32/2711289-1.